**Суцэльны тэкст ад 1 лютага 2021 года**

**Змяшчае праўкі ад 8 снежня 2023 года**

**Змяшчае праўкі ад 1 чэрвеня 2024 года**

# СТАТУТ БЕЛАРУСКАГА САЮЗА САЛІДАРНАСЦІ

## I Раздзел
## Агульныя палажэнні

### § 1

Аб’яднанне Беларускі Саюз Салідарнасці, званы ў далейшым "Аб’яднаннем", з'яўляецца няўрадавай арганізацыяй, якая валодае юрыдычнай асобай і ажыццяўляе грамадска карысную дзейнасць у публічнай сферы.

### § 2

1. Тэрыторыяй дзейнасці Аб’яднання з'яўляецца Рэспубліка Польшча, прычым у сітуацыях, неабходных для дасягнення мэтаў Аб’яднання, яно можа весці дзейнасць і па-за яе тэрыторыяй.
2. Офіс Аб’яднання знаходзіцца на ul. Tadeusza Kościuski 35B-E, 50-001 Уроцлаў.

### § 3

1. Аб’яднанне грунтуе сваю дзейнасць на дабравольнай працы яго сяброў. 2. Для ажыцяўлення сваёй дзейнасці Аб’яднанне можа наймаць супрацоўнікаў, у тым ліку сваіх сяброў.

### § 4

Аб’яднанне ажыццяўляе неаплатную і платную статутную дзейнасць у адпаведнасці з *Законам аб грамадскай карысці і валанцёрстве*.

## § 5

Аб’яднанне можа належаць да іншых нацыянальных арганізацый з падобнымі мэтамі і можа належаць да міжнародных арганізацый, калі такая прыналежнасць не парушае абавязацельстваў, якія вынікаюць з міжнародных пагадненняў, удзельнікам якіх з'яўляецца Рэспубліка Польшча.

## § 6

1. Аб’яднанне створана на неабмежаваны тэрмін. Яно дзейнічае ў адпаведнасці з палажэннямі закона "Аб аб’яднаннях" ад 7 красавіка 1989 года з пазнейшымі папраўкамі і гэтым Статутам.
2. Гэты Статут мае ідэнтычную польскамоўную версію.
3. У выпадку ўзнікнення сумненняў у інтэрпрэтацыі, прыярытэт будзе аддадзены польскамоўнай версіі.

# II Раздзел

# Мэты і спосабы працы

## § 7

Місіяй Аб’яднання з’яўляецца:

1. Натхняць і падтрымліваць дзейнасць па інтэграцыі і развіцці кантактаў і супрацоўніцтва паміж мясцовымі беларускімі і польскімі супольнасцямі. 2. Захаванне і распаўсюджванне традыцый, фарміраванне і развіццё нацыянальнай свядомасці беларусаў.
3. Інфармаванне польскага і еўрапейскага грамадства пра праблемы выканання правоў і свабод чалавека, грамадзянскіх правоў і пра сітуацыю ў Беларусі.

## § 8

Мэтамі Аб’яднання, што ажыццяўляе грамадска карысную дзейнасць, з'яўляюцца:

1. Дзеянне на карысць прафесійнай і сацыяльнай інтэграцыі мігрантаў з Беларусі ў Ніжняй Сілезіі;
2. Захаванне і распаўсюджванне традыцый і развіццё нацыянальнай, грамадзянскай і культурнай свядомасці беларусаў у Ніжняй Сілезіі; 3. Дзеянне па карысць інтэграцыі і развіцця кантактаў і супрацоўніцтва паміж мясцовымі беларускімі і польскімі супольнасцямі.

4. Прамоцыя Ніжняй Сілезіі і польскай культуры ў Беларусі і падтрыманне кантактаў;

5. Папулярызацыі і абарона свабод і правоў чалавека, грамадзянскіх свабод, а таксама дзеянняў па садзейнічанні развіццю дэмакратыі;

6. Дзеянне па садзейнічанні развіццю грамад і мясцовых супольнасцяў; 7. Захаванне і распаўсюд нацыянальных традыцый, выхаванне беларушчыны і развіццё нацыянальнай, грамадзянскай і культурнай свядомасці; 8. Дзеянне на карысць нацыянальных і этнічных меншасцяў і развіццё рэгіянальнай мовы;

9. Дзеянне на карысць інтэграцыі замежнікаў;

10. Дзеянне на карысць еўрапейскай інтэграцыі, развіцця кантактаў і супрацоўніцтва паміж супольнасцямі;

11. Дзеянне на карысць эканамічнага развіцця, у тым ліку развіцця прадпрымальніцтва;

12. Дзеянне на карысць развіцця культуры, мастацтва, захавання культурных каштоўнасцей і нацыянальнай спадчыны;

13. Дзеянне на карысць сацыяльнай дапамогі, у тым ліку дапамогі сем'ям і асобам, якія знаходзяцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, а таксама выраўноўванне шанцаў гэтых сем'яў і асоб;

14. Прадастаўленне бясплатнай юрыдычнай дапамогі і павышэнне прававой дасведчанасці грамадскасці;

15. Дзеянне на карысць дзяцей і моладзі, у тым ліку адпачынку дзяцей і падлеткаў;

16. Турыстыкі і краязнаўства;

17. Дзеянне на карысць еўрапейскай інтэграцыі і развіцця кантактаў і супрацоўніцтва паміж супольнасцямі;

18. Дзеянне на карысць ветэранаў і рэпрэсаваных асоб;

19. Прамоцыя Рэспублікі Польшча за мяжой;

20. Дзеянне на карысць няўрадавых арганізацый і арганізацый, зазначаных у артыкуле 3.3. закона, у аб’ёме, пазначаным у пунктах 1–32а.

**§ 9**

У межах неаплатнай і платнай дзейнасці на грамадскую карысць Аб’яднанне рэалізуе мэты наступнымі спосабамі:

1. Інфармацыйная і сацыяльная дапамога мігрантам з Беларусі; 2. Асветніцкая дзейнасць (нацыянальныя святы, семінары, сустрэчы); 3. Распаўсюджванне ведаў пра Беларусь і беларусаў, а таксама пра гістарычныя і культурныя сувязі жыхароў Ніжняй Сілезіі і Беларусі;

4. Культурная дзейнасць, мастацкі рух і творчасць, а таксама мастацкія імпрэзы, якія маюць важнае значэнне для беларускай культуры;

5. Захаванне памяці пра мясціны і падзеі, звязаныя з беларускай культурай і людзьмі, якія нарадзіліся ў Беларусі і жылі ў Ніжняй Сілезіі;

6. Вядзенне бібліятэкі і дакументацыі культурнага і мастацкага жыцця Беларусі; 7. Адукацыя і інтэграцыйныя мерапрыемствы для прадстаўнікоў беларускай і польскай супольнасцяў, у тым ліку для дзяцей і моладзі;

8. Інфармаванне польскага і еўрапейскага грамадства пра сітуацыю ў Беларусі; 9. Садзейнічанне пабудове грамадзянскай супольнасці ў краінах Усходняй Еўропы;

10. Падтрымка дзеянняў па абароне правоў чалавека і свабоды слова ў Беларусі; 11. Прасоўванне культурных дасягненняў Беларусі і іншых краін Усходняй Еўропы; 12. Падтрымка навуковых, культурных, палітычных і сацыяльных кантактаў паміж прадстаўнікамі краін Еўрапейскага Саюза і Усходняй Еўропы;

13. Ажыццяўленне выдавецкай і інфармацыйнай дзейнасці, уключаючы распрацоўку і публікацыю матэрыялаў, прысвечаных пытанням, што адпавядаюць мэтам Аб’яднання;

14. Арганізацыя масавых мерапрыемстваў, прысвечаных мэтам Аб’яднання;; 15. Арганізацыя канферэнцый, чытанняў, сустрэч і трэнінгаў, прысвечаных мэтам Аб’яднання;

16. Арганізацыя міжкультурных мерапрыемстваў, канферэнцый, семінараў, навучальных візітаў;

17. Ініцыяванне дэбатаў, выказванне меркаванняў і стварэнне прасторы для аналізу, экспертызы і абмеркавання пытанняў, важных для грамадзянскай супольнасці.

## § 10

У межах сваіх статутных мэтаў Аб’яднанне можа прадстаўляць калектыўныя інтарэсы сваіх сяброў перад органамі дзяржаўнай улады.

## § 11

Аб’яднанне можа ажыццяўляць прадпрымальніцкую дзейнасць на агульных прынцыпах, вызначаных асобнымі законамі. Даходы ад прадпрымальніцкай дзейнасці Аб’яднання служаць статутным мэтам і не могуць быць размеркаваны паміж яе сябрамі.

# III Раздзел

# Сябры Аб’яднання

## § 12

1. Сябрамі Аб’яднання могуць быць фізічныя і юрыдычныя асобы.
2. Юрыдычная асоба можа быць толькі падтрымчым сябрам.
3. Замежнікі, якія не пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Польшча, могуць далучацца да Аб’яднання.

## § 13

Аб’яднанне мае наступных сяброў:

1. сталых;
2. падтрымчых;
3. ганаровых.

## § 14

1. Сталым сябрам Аб’яднання можа быць фізічная асоба, якая валодае поўнай дзеяздольнасцю і карыстаецца ўсімі дзяржаўнымі правамі. Сталым сябрам Аб’яднання можа быць асоба, якая праз падачу дэкларацыі абавязваецца дзейнічаць на карысць дасягнення мэтаў Аб’яднання, выконваць палажэнні яго Статута і ўдзельнічаць у статутнай дзейнасці Аб’яднання.
2. Статус сталага сябра прысвойваецца па рашэнні Рады.
3. Падтрымчым сябрам можа быць фізічная або юрыдычная асоба, якая зацікаўленая ў дзейнасці Аб’яднання і якая прапанавала фінансавую ці матэрыяльную дапамогу або асабісны ўнёсак на яго карысць. Статус падтрымчага сябра прадастаўляецца рашэннем Рады пасля пісьмовага вызначэння прынцыпаў і абшару падтрымкі Аб’яднання.
4. Юрыдычная асоба дзейнічае праз свайго прадстаўніка. Прадстаўніком юрыдычнай асобы можа быць сябра Аб’яднання.
5. Ганаровым сябрам можа быць фізічная асоба, незалежна ад грамадзянства, якая зрабіла выбітны ўнёсак у дзейнасць і развіццё Аб’яднання, або якая мае асаблівыя заслугі ў дасягненні мэтаў, для якіх Аб’яднанне было створана. 6. Статус ганаровага сябра прысвойваецца Агульным Сходам на запыт Рады.

## § 15

1. Сталы сябра мае права на:

a) пасіўны і актыўны ўдзел у выбарах у кіроўныя органы Аб’яднання, b) занясенне прапаноў і вымог да кіроўных органаў Аб’яднання, а таксама на ацэнку іх дзейнасці,

c) ўдзел у сходах, лекцыях і мерапрыемствах, арганізаваных Аб’яднаннем, d) выкарыстанне дасягненняў і ўсіх формаў дзейнасці Аб’яднання,

e) абскарджванне рашэнняў кіроўных органаў Аб’яднання па пытаннях сяброўства.

2. Сталы сябра абавязаны:

a) выконваць Статут, рэгламенты і пастановы кіроўных органаў Аб’яднання,

b) рэгулярна сплачваць складкі і іншыя фінансавыя абавязанні Аб’яднання, c) актыўна ўдзельнічаць у дзейнасці Аб’яднання і рэалізацыі яго мэтаў, d) клапаціцца пра маёмасць і добрае імя Аб’яднання.

**§ 16**

1. Падтрымчы сябра мае права асабіста або праз прадстаўніка ўдзельнічаць у дзейнасці Аб’яднання з правам кансультацыйнага голаса і заносіць кіроўным органам Аб’яднання прапановы і вымогі, якія тычацца распачатых імі дзеянняў.

2. Падтрымчы сябра не мае актыўнага і пасіўнага выбарчага права. 3. Падтрымчы сябра абавязаны рэгулярна здзяйсняць заяўленую падтрымку і выконваць Статут і пастановы кіроўных органаў.

**§ 17**

1. Ганаровыя сябры не маюць пасіўнага і актыўнага выбарчага права. 2. Ганаровыя сябры могуць удзельнічаць з правам кансультатыўнага голасу ў статутных паседжаннях кіроўных органаў Аб’яднання.

3. Ганаровыя сябры маюць права заносіць прапановы і вымогі да кіроўных органаў Аб’яднання.

4. Ганаровыя сябры вызваляюцца ад выплаты сяброўскіх складак.

**§ 18**

1. Сяброўства ў Аб’яднанні спыняецца ў выніку:

a) смерці сябра або страты юрыдычнай асобы ў выпадку падтрымчага сябра,

b) добраахвотнай адмовы ад сяброўства ў Аб’яднанні, пададзенай у Раду ў пісьмовым выглядзе,

c) рашэння Рады пра выключэнне з Аб’яднання сталага сябра ў выпадку незасведчанай затрымкі выплаты сладак і іншых абавязанняў на карысць Аб’яднання або ў выпадку грубага парушэння палажэнняў Статута, рэгламенту або пастаноў кіроўных органаў Аб’яднання,

d) рашэння Агульнага Сходу сяброў пра выключэнне з Аб’яднання падтрымчага або ганаровага сябра ў выпадку грубага парушэння палажэнняў Статута, рэгламенту або пастаноў кіроўных органаў Аб’яднання.

2. Рашэнне Рады, згаданае ў пп. 1c, можа быць прынята пасля двух беспаспяховых запытаў у бок сябра Аб’яднання цягам 14 дзён сплаціць



запазычанасці або спыніцца парушаць палажэнні Статута, рэгламентаў або пастаноў

кiроўных органаў Аб'яднання.

3. У мэтах бяспекі доступ да спісу актуальных і былых сяброў Аб'яднання і іх даных маюць толькі Старшыня Рады і Старшыня Рэвізійнай Камісіі. Гэтыя асобы павінны прайсці праверку праз адмысловыя службы бяспекі.

## IV Раздзел

## Кіроўныя органы Аб'яднання

### § 19

Кіроўнымі органамі Аб'яднання з'яўляюцца:

1. Агульны Сход Сяброў;
2. Рада;
3. Рэвізійная Камісія.

### § 20

1. Тэрмін паўнамоцтваў для Рады складае 2 гады, а для Рэвізійнай Камісіі 3 гады.

2. Абранне Рады і Рэвізійнай Камісіі ажыццяўляецца шляхам адкрытага галасавання простай большасцю галасоў пры ўдзеле не менш за палову сяброў, якія маюць права голасу.

3. Сябры, абраныя ў кіроўныя органы Аб'яднання, могуць займаць тую ж пасаду больш за два тэрміны.

### § 21

У выпадках смерці, адстаўкі або выключэння сябра Рады або Рэвізійнай Камісіі падчас тэрміну яго паўнамоцтваў склад кіроўнага органа павінен папоўніцца цягам 30 дзён праз правядзенне выбараў на вакантную пасаду.

## Агульны Сход Сяброў

### § 22

1. Агульны Сход Сяброў – вышэйшы кіроўны орган Аб'яднання. 2. У Агульным Сходзе Сяброў удзельнічаюць сталыя сябры з правам голасу, а таксама падтрымчыя і ганаровыя сябры з правам кансультатыўнага голасу.

### § 23

1. Агульны Сход Сяброў можа быць чарговым або пазачарговым.



2. Агульны Сход Сяброў праходзіць ў адпаведнасці з прынятым ім рэгламентам. 3.

Чарговы Агульны Сход Сяброў склікаецца Радай адзін раз на год, у тэрмін да канца чэрвеня.

4. У асабліва абгрунтаваных выпадках Рада склікае Пазачарговы Агульны Сход Сяброў па ўласнай ініцыятыве або па запыце Рэвізійнай Камісіі або групы, якая налічвае не менш 1/3 сталых сяброў Аб'яднання.

5. Пра месца, тэрмін і парадак дня Агульнага Сходу Сяброў Рада паведамляе сябрам як мінімум за сем дзён да даты сходу.

6. Рашэнні Агульнага Сходу Сяброў прымаюцца шляхам адкрытага галасавання простай большасцю галасоў пры ўдзеле не менш за палову ўсіх сяброў, якія маюць права голасу, калі іншае не прадугледжана палажэннямі Статута.

7. Калі на Агульным Сходзе Сяброў недастаткова ўдзельнікаў для прыняцця рашэння ў адпаведнасці з п.6, галасаванне адкладаецца не менш чым на пятнаццаць хвілін. Пры паўторным галасаванні рашэнні Агульнага Сходу Сяброў прымаюцца адкрытым галасаваннем простай большасцю галасоў незалежна ад колькасці прысутных сяброў.

8. У абгрунтаваных выпадках дапускаецца галасаванне асобных сяброў з выкарыстаннем сродкаў электроннай сувязі.

9. Удзельнікі Агульнага Сходу Сяброў могуць быць прадстаўленыя асабіста ці праз дэлегатаў. Дэлегат можа размяркоўваць галасы згодна з жаданнем сяброў Аб'яднання, якія дэлегавалі яму свой голас. У іншым выпадку голас дэлегата ўлічваецца як сума ўсіх дэлегаваных яму галасоў у дадатак да яго ўласнага голасу. Дэлегат не можа прадстаўляць галасы больш як дзесяці сяброў, не ўлічваючы яго ўласны голас.

**§ 24**

1. У тых выпадках, калі Статут не акрэслівае паўнамоцтвы кіроўных органаў Аб'яднання, права прыняцця рашэнняў належыць Агульнаму Сходу Сяброў. 2. У кампетэнцыі Агульнага Сходу Сяброў уваходзіць, у прыватнасці: a) прыняцце Статута і змен у ім,

b) прысваенне і пазбаўленне статусу падтрымчага і ганаровага сябра, c) абранне і адзоў сяброў Рады і Рэвізійнай Камісіі,

d) разгляд і зацверджанне справаздач кіроўных органаў Аб'яднання, e) прыняцце праграмы дзейнасці Аб'яднання на год,

f) прыняцце рашэння пра спыненне дзейнасці Аб'яднання і размеркаванне яго маёмасці,

g) прыняцце бюджэту Аб'яднання.

## Рада

**§ 25**

1. Рада з'яўляецца выканаўчым органам і кіруе ўсёй дзейнасцю Аб’яднання, несучы адказнасць перад Агульным Сходам Сяброў.

2. У склад Рады ўваходзяць ад 3 да 6 сяброў, у тым ліку Старшыня і Намеснік Старшыні.

3. Рада дзейнічае на падставе прынятага ёю рэгламенту, зацверджанага Рэвізійнай камісіяй.

4. Рада праз Старшыню і Намесніка Старшыні рэпрэзентуе Аб’яднанне. 5. Рада прымае рашэнні простай большасцю галасоў пры ўдзеле паловы сяброў ад складу органа, у тым ліку Старшыні або Намесніка Старшыні. 6. У сітуацыі роўнасці галасоў вырашальным з’яўляецца голас Старшыні, а ў яго адсутнасць – голас Намесніка Старшыні.

7. Паседжанні Рады праводзяцца не радзей за раз на два месяцы. 8. Сябры Рады выконваюць свае функцыі на дабравольнай аснове. 9. Сябры Рады маюць магчымасць атрымліваць ўзнагароджанне за працу, здзейсненую ў сувязі з выкананай функцыяй.

**§ 26**

Да кампетэнцый Рады належыць:

1. Рэалізацыя рашэнняў Агульнага Сходу Сяброў;
2. Падрыхтоўка праектаў бюджэту Аб’яднання;
3. Кіраванне маёмасцю Аб’яднання;
4. Прынясце рашэнняў пра набыцце або продаж нерухомай або рухомай маёмасці;
5. Прынясце рашэнняў пра ўзяцце фінансавых абавязанняў у памеры, які не перавышае суму, устаноўленую Агульным Сходам сяброў;
6. Скліканне Агульнага Сходу Сяброў;
7. Прынясце рашэнняў пра прыём і выключэнне сталых і падтрымчых сяброў; 8. Запыт да Агульнага Сходу Сяброў з просьбай пра прызнанне статусу ганаровага сябра;
9. Справаздачнасць пра сваю дзейнасць Агульнаму Сходу Сяброў;
10. Прынясце рэгламентаў, прадугледжаных Статутам;
11. Вызначэнне памеру сяброўскіх складак і ўсіх іншых фінансавых абавязанняў на карысць Аб’яднання.

## Рэвізійная Камісія

**§ 27**

1. Рэвізійная Камісія з'яўляецца ўнутраным органам па кантролі за дзейнасцю Аб’яднання і складаецца з 2-3 сяброў, якія абіраюцца Агульным Сходам Сяброў.

2. Рашэнні Рэвізійнай Камісіі прымаюцца адкрытым галасаваннем простай большасцю галасоў пры ўдзеле не менш за двух сяброў. У сітуацыі роўнасці галасоў вырашальным з'яўляецца голас Кіраўніка, а ў яго адсутнасць - голас Намесніка Кіраўніка.

3. У пагадненнях паміж Аб'яднаннем і сябрам Рады, а таксама ў спрэчках з ім Аб'яднанне рэпрэзентуе сябра Рэвізійнай Камісіі, зазначаны ў пастанове гэтага органа.

**§ 28**

На першым паседжанні Рэвізійная Камісія абірае са свайго складу Кіраўніка і яго Намесніка.

**§ 29**

Да кампетэнцый Рэвізійнай Камісіі належыць:

1. Выснаў са справаздачы Рады пра выкананне фінансавага плана Аб'яднання;
2. Выснаў са справаздач па дзейнасці Рады;
3. Правядзенне перыядычных праверак дзейнасці Рады адносна правамернасці дзеянняў, у тым ліку адпаведнасці са Статутам і пастановамі Агульнага Сходу Сяброў;
4. Зварот да Рады з высновамі, вынікаючымі з праведзеных праверак; 5. Права патрабаваць склікання Пазачарговага Агульнага Сходу Сяброў у выпадку прызнання невыканання Радай абавязкаў, прадугледжаных Статутам, а таксама склікання паседжання Рады;
6. Скліканне Агульнага Сходу Сяброў, калі ён не склікаецца Радай у тэрмін, усталяваны Статутам.
7. Складанне на Агульным Сходзе Сяброў звароту пра ўхваленне фінансавай дзейнасці Рады Аб'яднання.
8. Складанне Агульнаму Сходу Сяброў справаздач па дзейнасці; 9. Заключэнне працоўных і грамадзянска-прававых умоў з сябрамі Рады; 10. Рэпрэзентацыя Аб'яднання ў спрэчках з сябрамі Рады.

**§ 30**

У выпадку, прадугледжаным у §29 п.5, Пазачарговы Агульны Сход Сяброў павінен адбыцца не пазней чым праз 30 дзён з даты падачы запыту, а паседжанне Рады – не пазней за 14 дзён з даты падачы запыту.

**§ 31**

Сябрам Рэвізійнай Камісіі не можа быць:

1. Сябра Рады або яго/яе муж ці жонка;

2. Асоба, якая мае з сябрам Рады роднасныя адносіны;

3. Асоба, якая знаходзіцца з сябрам Рады ў службовых адносінах або ў падпарадкаванні па пасадзе;

4. Асоба, асуджаная па законе за злачынства, здзейсненае наўмысна.

**§ 32**

1. Рэвізійная Камісія дзейнічае на падставе прынятага ёю рэгламенту. 2. У пагадненнях паміж Аб’яднаннем і сябрам Рады, а таксама ў спрэчках з ім Аб’яднанне рэпрэзентуе сябра Рэвізійнай Камісіі, зазначаны ў пастанове гэтага органа.

3. Сябры Рэвізійнай Камісіі маюць права на кампенсацыю дакументальна пацверджаных выдаткаў, панесеных непасрэдна ў сувязі з выкананай функцыяй.

## V Раздзел

## Маёмасць і фінансавая гаспадарка Аб’яднання

**§ 33**

Маёмасць Аб’яднання фарміруецца з::

1. сяброўскіх складак,
2. ахвяраванняў, завяшчанняў, спадчыны, сродкаў, атрыманых ад прыватных ахвяраванняў, публічных збораў,
3. прыбыткаў ад статутнай дзейнасці Аб’яднання,
4. даходаў ад маёмасці Аб’яднання,
5. субсідый з дзяржаўнага бюджэту, мясцовага самакіравання і няўрадавых арганізацый,
6. нацыянальных і замежных грантаў,
7. даходаў ад прадпрымальніцкай дзейнасці, якая ажыццяўляецца на падставе асобнага заканадаўства,
8. даходаў ад нерухомай і рухомай маёмасці, якая знаходзіцца ва ўласнасці або ў карыстанні Аб’яднання.

**§ 34**

Сябры сплачваюць складкі ў адпаведнасці з правіламі, усталяванымі Радай.



**§ 35**

1. Аб’яднанне вядзе фінансавую гаспадарку ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.
2. Рашэнне пра набыццё, продаж і абцяжаранне маёмасці Аб’яднання прымае Рада.

## Спосаб рэпрэзентацыі

### § 36

Два сябры Рады, якія дзейнічаюць сумесна, маюць права падаваць заявы пра намеры Аб’яднання і браць на сябе маёмасныя абавязанні ад імя Аб’яднання.

## VI Раздзел

## Змены Статута і спыненне дзейнасці Аб’яднання

### § 37

Рашэнне пра змену Статута Аб’яднання прымаецца Агульным Сходам абсалютнай большасцю галасоў пры ўдзеле не менш за палову сяброў, якія маюць права голасу.

### § 38

1. Спыненне дзейнасці Аб’яднання адбываецца па рашэнні Агульнага Сходу Сяброў, прынятага простай большасцю галасоў, пры ўдзеле не менш за палову членаў, якія маюць права голасу.
2. Пры прыняцці рашэння пра спыненне дзейнасці Аб’яднання Агульны Сход Сяброў вызначае парадак ліквідацыі і прызначэння маёмасці, а таксама прызначае ліквідатара.
3. Маёмасць, якая засталася пасля ліквідацыі Аб’яднання, можа быць прызначана на:

a) дасягненне мэтаў, аналагічных статутным задачам Аб’яднання, b) садзейнічанне іншым грамадскім арганізацыям, аб’яднанням і фондам, якія дзейнічаюць для дасягнення тых жа мэтаў, што і ў гэтым Статуце.

### § 39

У пытаннях, якія тычацца спынення дзейнасці і ліквідацыі Аб’яднання, прымяняюцца палажэнні *Закона аб аб’яднаннях.*